УДК 94 (476)

*І.Р. Вуглік*

# ЗАСТОЛЬНЫ ЭТЫКЕТ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ XVII–XVIII СТ.: ТЫПАЛОГІЯ, ГІСТАРЫЧНЫЯ ЗМЕНЫ

У артыкуле разглядаецца адзін з істотных элементаў бытавой культуры шляхты часоў Рэчы Паспалітай – этыкет, у прыватнасці яго значны кампанент – этыкет застольны. Вызначаецца месца гэтага віду этыкета ў шляхецкай культуры, яго функцыі, а таксама змены, якія адбыліся ў паводзінах за сталом з першых дзесяцігоддзяў XVIII ст. і былі звязаны з агульнымі, эпахальнымі пераменамі ў гісторыі еўрапейскай культуры ў накірунку яе рэгламентацыі і эстэтызацыі. Шляхецкі застольны этыкет утрымліваў як характэрныя аўтэнтычныя полікультурныя (поліэтнічныя), так і еўрапейскія элементы; асноўны вектар яго арыентацыі з XVIII ст. быў заходнееўрапейскі. Гэта праявілася ў нормах паводзін, сталовых прыборах, характары спажывання ежы. Як культурная з'ява ён прадстаўляў поліэтнічную культурную шляхетскую супольнасць Рэчы Паспалітай і з'яўляўся адной з яе рэферэнтных праяў. Шляхецкі застольны этыкет упісваўся ў гісторыка-стылістычную тыпалогію барока і класіцызма.

## Уводзіны

У грамадстве Рэчы Паспалітай XVII–XVIII ст., куды ў складзе Вялікага княства Літоўскага ўваходзілі беларускія землі, дамінуючае месца займала шляхта. Культура гэтага палітычна і эканамічна пануючага класа была мадэльнай для іншых слаёў грамадства – гараджан, жыхароў мястэчак, заможных сялян. Таму вывучэнне шляхецкай культуры (культуры ліцвінскай, ці, па-сучаснаму, старабеларускай шляхты) з'яўляецца актуальным як для даследавання гісторыі культуры Беларусі дадзенага перыду, так і наступнай гістарычнай эпохі знаходжання беларускіх земляў у складзе Расіі, дзе шляхта (дваранства) з'ўлялася каталізатарам істотных палітычных, культурных з'яў. Сярод разнастайных адметных рысаў культуры шляхты часоў старажытнай Рэчы Паспалітай адно з цэнтральных месцаў займала застолле, паводзіны за сталом. Гэта было звязана з акцэнтаванай рэпрэзентацыйнасцю шляхетскай культуры, што зрабілася асабліва заўважным з XVIII ст. Культура Беларусі, якая знаходзілася ў дадзены перыяд у рэчышчы еўрапейскай цывілізацыі, актыўна рэзаніравала еўрапейскія навацыі, засвойвала, перарабляла іх зыходзячы з уласных традыцый. Гэта было ўласціва ў першаю чаргу для шляхты, поліэтнічная бытавая культура якой у XVIII ст. выйшла на дастаткова высокі ўзровень. Застолле XVIII ст. апісвалася тагачаснымі аўтарамі, у першаю чаргу Е. Кітовічам [1, с. 419–421, 460]; яго асноўныя рысы абагульнены А. Мальдзісам [2, с. 340–347], аўтарам артыкула [3, с. 28–38]. Разам з тым актуальным з'яўляецца вывучэнне застольнай бытавой культурыі, яе гістарычных змен на працягу ўсяго перыяду Рэчы Паспалітай, а таксама ў параўнальна-еўрапейскім кантэксце, што і з'яўляецца мэтай гэтага артыкула.

## Застольны шляхецкі этыкет у еўрапейскім кантэксце

Сярод асноўных відаў бытавых паводзін шляхты: палявання, танцаў – застоллю належала значная роля, якая ўзмацнялася з цягам часу. Шляхецкая бяседа мела шэраг адметных агульных рысаў, якія адпавядалі еўрапейскай стылістыцы. Шляхецкае застолле ніколі не было простым спажываннем ежы, а мела выгляд семантычнага рытуалу, дзе асноўнымі тэмамі былі братэрства, узаемная пашана, гасціннасць; акрамя гэтага на застоллях пад час соймаў і соймікаў вырашаліся дзелавыя, палітычныя справы [3, с. 28 – 29]. У Рэчы Паспалітай застольны рытуал уключаў дзве часткі: у першай гаспадар піў за здароў'е кожнага з гасцей сам на сам, у другой – гаспадар і найбольш знакамітыя госці пілі ў гонар адзін аднаго з вялікага кубка (келіха), астатніх гаспадар

шанаваў сацыяльнымі групамі (у гэты час усе ўставалі) [3, с. 32–33]. Як станоўчую рысу старажытнага этыкета трэба адзначыць сумесную прысутнасць за адным сталом мужчын і жанчын, ужыванне імі напоя з кубка. Гэта істотна адрознівала шляхецкае застолле ад рытуала традыцыйнай культуры суседзяў: у Расіі XVII ст. у заможных сем'ях жанчыны елі асобна ў сваіх пакоях з пакаёўкамі [4, с. 137–138]. У якасці ў пэўнай ступені негатыўнай рысы, якая была зваротным бокам шляхецкай гасціннасці, можна адзначыць звычай XVIII ст. празмернага частавання гасцей спіртнымі напоямі, намаганні гаспадара зрабіць усё, каб госці не здолелі ехаць да хаты.

З XVI ст. у Еўропе распаўсюдзіўся стыль паводзін, які быў звязаны са з'яўленнем у еўрапейскіх дзяржавах новага вышэйшага арыстакратычнага слоя, паняццем «civilite`» (якое выцесніла сярэдневяковае «courtoisie»), што прадугледжвала пачцівыя манеры, дасканалае веданне этыкета, тактоўнасць, а таксама назіральнасць, уважлівасць да сваіх і чужых паводзін, самакантроль [5, с. 132, 141]. Гэта была пераломны час, пасля якога сярэдневяковае пачало лічыцца брудным, неахайным, нават недастойным узгадвання, рэзка вырасла колькасць табу ў паводзінах, што кадыфікавалася ў шматлікіх трактатах аб прыстойных манерах.

Сярод новых патрабаванняў XVI ст. былі правіл здымаць за сталом шляпу, рэзаць, а не ламаць хлеб, частку прапанаванага лепшага кавалка мяса, ў сваю чаргу, прапанаваць таму, хто яго перадаў ці суседу, косці і рэшткі ежы кідаць на падмогу; забарона казаць пры ўсіх, што дадзеная страва шкодная для асабістага здароў'я, гаспадару не лічылася непрыстойным папрасіць выбачэння за сціплы стол, але забаранялася казаць аб кошце страў (Э. Ратэрдамскі) [5, с. 148, 156, 157].

Асаблівая ўвага надавалася спажыванню найбольш распаўсюджаных страў. перш-наперш соўсаў, якія былі істотным кампанентам тагачаснай ежы, у першую чаргу мясной. Лічылася, што дакрананне рукамі да соўсаў выглядае непрыемна, у соус трэба было макаць хлеб, але не ў якім разе не пальцы. Для старажытнай беларускай кухні, як традыцыйнай (народнай), так і шляхецкай, ужыванне соўсаў у еўрапейскім разуменні (не як простая падліва) не было характэрна; соўсы з'явіліся на сталах шляхты дастаткова позна – прыблізна з другой паловы XVIII ст.

Значная ўвага надавалася спажыванню традыцыйнага для застолляў заможнай часткі грамадства мяса. У XVI–XVII і зрэдку ў XVIII ст. тушу разбірвалі на агульным стале; гэта мог рабіць гаспадар ці паважаны госць, і яе правільнае разбіранне з'яўлялася істотнай часткай бытавой культуры ўвогуле, які паляванне, танцы, фехтаванне. Аднак паступова гэта мастацтва знікла нават з поварскага асяроддзя, абразу пачаў выклікаць і вялікі мясны абед з яго агромністымі кавалкамі мяса, што было звязана з рухам да агульнага пачуццёвага стандарту, калі чалавек усяляк пазбягаў асацыяцый мяснога блюда з забітай жывёлай [5, с. 188].

У старажытнай Рэчы Паспалітай новы стыль бытавых паводзін распаўсюджваўся з XVII ст., прычым адбывалася гэта з пэўнымі цяжкасцямі. Так, узровень «абслугоўвання» за сталом быў абумоўлены статусам госця і месцам яго знаходжання за сталом: лепшыя прыборы з серабра, новыя талеркі для кожнай стравы падаваліся найбольш паважаным гасцям, якія сядзелі ў сярэдзіне. Што да тых, хто размяшчаўся на канцах, дык яны карысталіся адной талеркай, якая паступова напаўнялася агрызкамі і косткамі – талеркі з імі аддавалі слузе ці (калі яго не ўдавалася дазваццa) выкідвалі ў кут, а самыя недасведчаныя выкідвалі дробныя адходы ежы пад стол [1, с. 225]. Не садзейнічаў гігіене і старажытны звычай піць па чарзе з аднаго кубка. Лыжку пазычалі ў суседа ці рабілі з нажа і хлебнай скарынкі, на чысціню посуда звярталі мала ўвагі; дбаць пра этыкет, як лічыць А. Мальдзіс, пачалі з часоў эпохі Асветніцтва [2, с. 341–342], але нельга не заўважыць, што нармаванне застольных паводзін выразна бачна з XVII ст.

Рухавіком культуры застолля было дыстанцыраванне паміж чалавекам і ежай, павышэнне дыяпазона пачуццёвай агіднасці. Гэта выклікала з'яўленне ў прадметнай сферы шэрагу медыятараў паміж чалавекам і ежай: відэльца, зубачыстак, а таксама ўстаноўку на выключнае карыстанне сталовымі прыборамі. З'явілася значная колькасць табу на ежу рукамі, адзначаная ў «Новым трактаце» А. Де Куртэна 1672 г. і запазычаная іншымі аўтарамі XVIII ст.: забаранялася, як найбольш агіднае, аблізваць пальцы, залязаць пальцамі ў соўс, браць імі соль, есці рукамі мяса (трактат 1774 г. дэ Ла Саля) [5, с.165–166].

З традыцыйных для сучаснага стала прыбораў пазней за ўсё ў Еўропе і на нашых землях з'явіўся відэлец. У сваёй традыцыйнай функцыі (для непасрэднай ежы) відэлец прыйшоў у Еўропу, хутчэй за ўсё, з Візантыі IV ст., пачаў шырока распаўсюджвацца ў Еўропе з другой паловы XVI ст.. Пры выкарыстанні відэльца лічылася непрыстойным класці яго вострымі канцамі на талерку. Шляхта пачала ім карыстацца з XVII ст., аднак па краях сталоў відэльцаў не клалі, госці маглі прыносіць нож, лыжку, зрэдку відэлец з сабой. Асабліва трэба адзначыць раннюю выяву відэльца на іконе «Тройца» Маркіянавіча (1761 г., с. Чыжэвічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці): прыбор старажытны, прамы, з дзвумя рабочымі канцамі, але ручка зроблена ўжо асобна ад працоўнай часткі. Акрамя прыбораў індывідуальнага карыстання, ў Рэчы Паспалітай існавалі асобныя вялікія лыжкі, а таксама відэльцы і нажы для раздачы ежы.

Працяглы час характар размяшчэння сталовых прыбораў не быў дакладна вызначаны і адрозніваўся ад сучаснага: яшчэ ў трактаце де Л Саля 1774 г. лыжку, нож і відэлец патрабавалася класці справа, бо так гэта прынята было рабіць у тагачаснай Еўропе. У вышэйшых слаях еўрапейскага грамадства ў канцы XVIII ст. па правы бок талеркі клалі супавую лыжку, нажы для рыбы і мяса, па левы – відэльцы для закускі, рыбы, мяса, перад талеркай – відэлец, лыжку ці нож для саладкага; для фруктаў і дэсерту прыносілі новыя прыборы [5, с. 173]. Такі ж самы расклад сталовых прыбораў склаўся ў XVIII ст. у Рэчы Паспалітай.

На шматлікіх беларускіх іконах з сюжэтам Тройцы мы бачым лыжкі і нажы (ці толькі нажы) але па прычыне не заўсёды дасканалага, з пункту гледжання сіметрыі, пераводу абразоў з узораў-кужбушак, сказаць дакладна аб размяшчэнні прыбораў складана. Разам з тым был і пэўная сістэма размяшчэння: на шэрагу абразоў, як на іконе апошняй чвэрці XVII ст. з с. Дастоева Іванаўскага р-на Брэсцкай вобласці, лыжка ляжыць справа ад талеркі, нож – злева; на іконе Маркіянавіча нож і відэлец ляжаць паралельна.

Вялікае месца ў застольным этыкеце з XVII ст. заняла сурвэтка і яе выкарыстанне. Сурвэткай у XVII ст. абціралі лыжку перад тым, як макнуць яе ў агульную страву (гэта лічылася адметнай рысай «далікатных» людзей), нож перад тым, як рэзаць хлеб, відэлец, а так сама выціралі. Разам з тым, калі пальцы былі моцна запэцканыя тлушчам, іх можна было спачатку выцерці аб кавалак хлеба, які пакідаўся на талерцы, а потым – аб сурвэтку (хаця гэта ў некаторых трактатах лічылася непрыстойным). Аб сурвэтку не раілася выціраць пальцы, ёй нельга было выціраць твар, пот, церці зубы, тым больш у яе нельга было смаркацца – дзеля гэтага рэкамендавалася хустка. У другой палове XVIII ст. сурвэтка першапачаткова клалася на талерку, потым замацоўвалася пад каўнерам (засоўваць яе за каўнер лічылася недапушчальным), яна павінна была закрываць цела да кален; у апошняй чвэрці XVIII ст. сурвэтку патрабавалася класці на калені. У канцы XVI – пачатку XVII ст. у Рэчы Паспалітай таксама ўсталяваўся звычай класці пры талерцы вялікую белую сурвэтку: яна павінна была бараніць грудзі, яе канцы завязваліся на карку; у заможных дамах падавалі яшчэ малыя сурвэткі, якія прыкрывалі хлеб на талерцы [6, с. 228], калі сурвэтак усім не хапала, іх замянялі насавымі

хустачкамі. Са з'яўленнем шкляных келіхаў і кілішкаў іх пачалі выціраць сурвэткай, на сталы клалі драўляныя, спецыяльна зробленыя зубачысткі [1, с. 225–226].

На сталах з'явіўся індывідуальны зменны посуд, перад кожным ставіліся кілішкі для віна і вады. Змянілася, зрабілася барочным і эстэтычнае аздабленне стала: з распаўсюджваннем прысмакаў, цукерак з'явіліся вялікія цукерніцы, якія займалі сярэдзіну стала – яны складаліся з шкляных пласцін і нагадвалі галерэю, замыкаліся сервізамі (ці адным у цэнтры стала) зялёнага колеру с краямі, заклеенымі спецыяльнай белай паперай. На іх стаялі зробленыя з гіпсу фігуркі людзей, асілкаў, коннікаў, шасціконных карэт. Кампазіцыйна цукерніца імітавала агарод, дрэва з гірляндамі, вуліцу з камяніцамі, палацамі, замкамі, трыумфальнымі аркамі, калонамі, у сярэдзіне звычайна мясцілася альтанка з гербом гаспадара ці госця, у гонар якога давалася бяседа [1, с. 233–234]. З'явілася вялікая колькасць новага спецыяльнага посуду і сталовых прыбораў: вялікія, да паўметра ў вышыню срэбныя чатырохузроўневыя вежы – сервізы для спецый, аліў, гарчыцы, а таксама салатніцы, цукерніцы, відэльцы і нажы для рыбы, лыжачкі для варэння, цукру.

Прыкладна з другой чвэрці XVIII ст. зніклі вялікія місы, ежа на шляхецкі стол стала выносіцца і класціся не разам (некалькі мясных страў у адну місу), а асобна, пэўны кавалак у асобны посуд; на адзін вынас магло прыходзіцца да шасцідзесяці і болей невялікіх па памерах страў: гэта давала магчымасць кожнаму з гасцей пакаштаваць кожнай хоць па трошку. Ежа стала болей для спробы, чым для задавальнення добрага апетыту, што звязвалася з уплывам французскай моды [1, с. 229]. Сярод навацый XVIII ст., звязаных з паляпшэннем смакавых пачуццяў ад прыняцця ежы, з'явіўся звычай спажываць яе цёплай, дзеля чаго у срэбныя талеркі налівалі спірт і яго падпальвалі, фарфоравыя талеркі загадзя трымалі ў цёплай вадзе, бо паўторны разагрэў стравы, як лічылася, псаваў апетыт [1, с. 232]. Дадатковы эстэтычны эфект надавала музычнае суправаджэнне ежы.

**Заключэнне**

Такім чынам, у XVIII ст. хатняе застолле зрабілася для шляхціца мадэльным паказчыкам яго іміджу, што спрыяла дынамічнаму развіццю ўсіх кампанентаў бяседы, актыўнаму запазычванню еўрапейскіх навацый. Стылістычна шляхецкае застолле адпавядала асноўным прынцыпам еўрапейскай бяседы з яе адкрытым для мужчын і жанчын, разнастайных дзелавых размоў. Разам з тым шляхецкая бяседа мела сваю спецыфічную структуру, якая складалася з двух асноўных частак. Культура застольных паводзін старабеларускай шляхты зазнала ў першых дзесяцігоддзях XVIII ст. значныя змены, асноўныя інтэнцыі якіх звязаныя з культываваннем чысціні, індывідуалізацыі сталовых прыбораў і посуду, агіднасці да публічнага выражэння цялесных праяўленняў. Сярод найбольш значных кампанентаў, якія зазналі змены, можна адзначыць выкарыстанне відэльца, сурвэткі, пашырэнне відавога і парцыённага дыяпазона страў, а таксама сталовых прыбораў, павышаную ўвагу да густэмнай складаючай ежы, этычнага аздаблення стала. Тыпалагічна застольныя паводзіны прыкладна да сярэдзіны XVIII ст. звязаны са стылістыкай жыццесцвярджальнага барока, пазней – з рэгламентацыйным, размеркаваным, стрыманым светаўспрыманнем класіцызму. Асноўныя этнічныя ўплывы на шляхецкае застолле зрабілі французская, італьянская нормы этыкету.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. 1. Kitowicz, J. Opis obyczaj`ow za panowania Augusta III / J. Kitowicz. – Warszawa : Panstwowy Instytut Wydawniczy, 1985. – 436 s.

2. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс. – Мн. : Лімарыус, 2001. – 384 с.
3. Вуглік, І.Р. Матэрыяльная культура і быт старабеларускай шляхты XVII–XVIII ст. / І.Р. Вуглік. – Мн. : ЗАТ «Современные знания», 2005. – 84 с.
4. Байбурин, А.К. У истоков этикета. Этнографические очерки / А.К. Байбурин, А.Л. Топорков. – Л. : «Наука». 1990. – 165 с.
5. Элиас, Н. О процессе цивилизации. Социогенетические и психологические исследования. Изменения в поведении высшего слоя мирян в странах Запада : 2 т. / Н. Элиас. – М. – СПб : Университетская книга, 2001. – Т. 1. – 331 с.
6. Gloger, Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana : w 4 t. / Z. Gloger– Warszawa : Wiedza Powszehna. – 1978. – T. 4. – 523 s.

***Vuhlik I.*** **Drinking Etiquette old Belarusian gentry XVII–XVIII century: typology, historical changes**

The article examines an essential element of consumer gentry culture – prandial etiquette, its main components, historical changes. It is concluded that prandial etiquette was a symbolic part of everyday culture gentleman, was a system that had a pan-European as well as specific features. Significant changes of etiquette, which have brought him to a modern, occurred in the eighteenth century and were associated with the Western European influence.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 19.03.2010